**Міжнародная праграма**
**Belarus Beehive “Падтрымка грамадзянскай супольнасці як ключавога рухавіка дэмакратычнай трансфармацыі Беларусі”**

**абвяшчае набор на вакансіі для штатных пазіцый**

**Назва пазіцыі:** Middle Grant Manager

**Месцазнаходжанне:** Вільня

**Працягласць:** 15 месяцаў

**Працоўная нагрузка:** 100%

**Прыблізная дата пачатку:** Красавік 2025 года

**Крайні тэрмін падачы заявак:** Заяўкі разглядаюцца па меры паступлення, канчатковы тэрмін падачы – 30 сакавіка 2025 года.

**Апісанне пазіцыі:**

Цесна супрацоўнічае з старэйшым грантавым менеджарам і садзейнічае эфектыўнай падтрымцы беларускіх грамадскіх арганізацый шляхам фінансавання іх дзейнасці праз субгранты.

Middle Grant Manager падтрымлівае рэалізацыю субгрантаў, прадастаўленых праектам Beehive, і дапамагае старэйшаму грантаваму менеджару ў запуску і маніторынгу іх выканання.

Асноўныя абавязкі

- Кансультуе заяўнікаў адносна ўмоваў конкурсу і адказвае на пытанні адносна запаўнення заявак;
- Дапамагае старэйшаму грантаваму менеджару збіраць праектныя прапановы і правярае іх адпаведнасць фармальным крытэрыям;
- Узаемадзейнічае з заяўнікамі, інфармуе іх аб статусе заяўкі;
- Дапамагае ў працэдурах заключэння кантрактаў;
- Кансультуе субгранцёраў па пытаннях рэалізацыі дзейнасці, яе працягнення і прапанаваных змяненняў;
- Дапамагае ў вырашэнні складаных пытанняў, якія могуць узнікнуць;
- Прымае і перадае інфармацыю, звязаную з рэалізацыяй праектаў, а таксама статусам справаздачнасці субгранцёраў;

- Дапамагае субгранцёрам у падрыхтоўцы справаздач і правярае іх адпаведнасць фармальным крытэрыям;
- Узаемадзейнічае са спецыялістамі па маніторынгу.

**Неабходныя навыкі і досвед**

- Ступень бакалаўра або магістра ў адпаведнай галіне
- Мінімум два гады досведу ў кіраванні праектамі або рэгрантынгу
- Добрае веданне аперацыйнага асяроддзя ў Беларусі, уключаючы асаблівасці падтрымкі развіцця грамадзянскай супольнасці ў нестабільных умовах, працы з грамадскімі арганізацыямі і актывістамі ў эміграцыі і ўнутры краіны. Выдатнае разуменне патрабаванняў бяспекі пры планаванні і рэалізацыі дзейнасці.
- Свабоднае валоданне беларускай і англійскай мовамі

**Прапановы па ўзнагароджанні**

Прыблізны месячны заробак можа складаць да 2200 еўра (да выліку падаткаў) у залежнасці ад досведу.

**Працэдура падачы заяўкі**

Калі вас цікавіць гэтая пазіцыя, калі ласка, дашліце сваё рэзюмэ і матывацыйны ліст (на англійскай мове) на электронную пошту **lot1@belarusbeehive.eu** з тэмай **“Middle Grant Manager”**. У матывацыйным лісце неабходна паказаць, як вашыя навыкі і папярэдні/цяперашні прафесійны досвед адпавядаюць абавязкам і адказнасцям, вызначаным для гэтай ролі.

Калі ласка, дадайце кантактныя дадзеныя двух рэкамендадаўцаў, якія змогуць прадставіць інфармацыю аб вашым прафесійным досведзе ў выпадку, калі вы будзеце адабраны для сумоўя.

Толькі адабраныя кандыдаты будуць запрошаныя на сумоўе.

Заяўкі будуць разглядацца па меры паступлення, таму настойліва рэкамендуем падаць заяўку як мага хутчэй. Канчатковы тэрмін падачы – **30 сакавіка 2025 года**.